Чорныя навінкі



Нелегальных людзей
НЕ БЫВАЕ

БЕЛАРУСЬ

Рэспубліка Тампон

Эўропа: «З тампонамі «RB» я адчуваю сябе о'кей! О'кей ЭрБі!» ▶

Адным з асноўных пытаньняў на апошнім саміце Эўрапейскага саюзу ў Гётэборгу была далейшая інтэграцыя новых членаў – краінаў Цэнтральнай і Усходняй Эўропы. Аднак канчатковага ўвядзеньня нашых суседзяў з усімі ўцякаючымі і выцякаючымі наступствамі не адбылося. Членаў у чарговы раз «папрасілі» трошкі пачакаць. Маўляў, у бабулькі ЭС зноў крытычныя дні: і дэманстранты-антыглябалісты бушуюць (у Гётэборгу, між іншым, шпацырыў сам Буш-юніёр), і Ірляндыя (як адна з «кволых» членаў эканамічнай супольнасьці) ня вельмі жадае дзяліцца субсыдыямі з новымі «прымакамі». Але існуе яшчэ адна прычына абстынэнцыі, якую наша, здавалася б, сталая кабета-Эўропа саромеецца называць уголас – іміграцыя.

«Бескантрольныя патокі» мігрантаў з больш бедных краінаў даўно ўжо сталі нечым накшталт псыхозу міжнароднага ўзроўню, нягледзячы на тое, што напрыклад у ЭС, па падліках экспэртаў OECD, за апошнія гады ўвогуле не назіралася якогасьці павелічэньня «напліву» ўцекачоў, імігрантаў і г.д. Хутчэй наадварот: «крэпасьць-Эўропа» ніколі не была настолькі моцнай, як зараз. Гэтаму ёсьць простае тлумачэньне, якое адначасова дапамагае зразумець, чаму дагэтуль інтэграцыя новых кандыдатаў праходзіць быццам праз дупу. «Цывілізаваныя эўрапейцы» распрацавалі арыгінальную канцэпцыю аховы агульных межаў, ключавое паняцьце якой на брусэльскім бюракратычным жаргоне правакуе даволі канкрэтныя асацыяцыі – «краіна-тампон». У лік трапіўшых у катэгорыю дзяржаў, дарэчы, уваходзіць і Беларусь. Але аб гэтым трошкі пазьней. Ёсьць такая гіпотэза: толькі паспрабуй ЭС адкрыць сваё лона для ўсходніх мужланаў – і па ёй ужо заўтра пачнуць гойсаць натоўпы п'яных і танных Вацэкаў, Ёнасаў, Гржымелькаў і іншых Фэрэнцаў, зьбіваючы кошты на рынку працы і правакуючы запаленчыя працэсы сацыяльнай нестабільнасьці. Усьлед за імі папруць яшчэ больш п'яныя і танныя Мыколы, Язэпы, Ванькі, Асланы… І ўжо гэткай групавухі спадарыня Стары Сьвет ня вытрывае. У выніку Заходняя Эўропа з кожным годам усё больш зачыняе свае ўсходнія межы і няспынна перагладае правы ўцекачоў, патрабуючы таго ж ад іншых. Палякі, чэхі і вэнгры «стрымліваюць» таго ж ад іншых. Палякі, чэхі і вэнгры «стрымліваюць» беларусаў і ўкраінцаў, а «Малады азіятаў» у выглядзе беларусаў і ўкраінцаў, а «Малады Фронт» марыць паставіць сінявокай Беларусі непралазны пояс вернасьці на шляху «азіятаў з Расеі», тым часам, калі Маскву рэгулярна «адмываюць» ад «чарнамазых і вускаглазых»…

Усё пачалося ў 1991 годзе, неўзабаве пасьля распаду ўсходняга блёку, а разам зь ім і зьнікненьня патрэбы ў такім сродку падтрыманьня іміджу «вольнага сьвету», якім дагэтуль зьяўлялася Жэнэўская Канвэнцыя аб правах уцекачоў. Раней жадаючых атрымаць палітычны прытулак было ня толькі няшмат, але апошнія, асабліва з Усходняй Эўропы, ідэальна адпавядалі клясычным крытэрам «палітычных»: звычайна асоба мужчынскага полу, сьвядомы дысыдэнт, часта інтэлектуал ці паэт, пажадана з бачнымі сьлядамі катаваньняў на целе, які, нягледзячы на ўсе перашкоды, здолеў зьбегчы з камуністычнага пекла ў дэмакратычны рай. Але сьвет зьмяніўся, і хоць пазьней у Эўропе і зьявіліся адзіночныя «пудзілы» кшталту Рыгорыча, якія падтрымліваюць гэты архаічны імідж уцекача, асноўная маса шукаючых паратунку спалучае палітычныя і эканамічныя матывы, паміж якімі часта вельмі цяжка правесьці якуюсьці мяжу. Гэтых людзей цяжка выкарыстоўваць у якасьці сымбаляў «ахвяраў рэпрэсій», яны не зьяўляюцца вялікімі навукоўцамі і не напісалі «Архіпелаг Гулаг». Яны «палітычна некарэктныя». Але галоўнае тое, што пад гэтую катэгорыю падпадаюць мільёны людзей, прымаць якіх Заходняя Эўропа ня мае ніякай карысьці. Таму 30 лістапада 1991 году эўрапейскія міністры па справах іміграцыі прынялі палажэньне аб «трэцяй бясьпечнай краіне»: уцекачы, якія прыбываюць да межаў Эўрасаюзу з боку гэтай краіны, адсылаюцца туды без усялякіх тлумачэньняў.

Шлях да

▲ **Жнівень 1928 году. Імігранты з Заходняй Беларусі адразу пасьля прыбыцьця на вакзал гораду Клійвэнд (ЗША).**

Гісторыя сёньняшняй цывілізацыі – гэта бясконцая гісторыя эміграцыі. Людзі ўвесь час перамяшчаліся зь месца на месца, ганімыя катаклізмамі, ледавікамі, войнамі, дрэннымі ўладамі і проста жаданьнем перамяшчацца. Вывучэньне гісторыі ў школе пачынаецца зь вялікага рассяленьня народаў. Хаця тэрмін «рассяленьне» ня вельмі дакладны, прынамсі з той нагоды, што землі, куды прыходзілі старажытныя плямёны, не былі пустыя.

Гісторыя апісвае доўгі шлях эміграцыі габрэйскага народу з Эгіпту пад кіраўніцтвам Майсея. З падручнікаў гісторыі мы можам даведацца, што, напрыклад, славяне – гэта тысячамі ж эмігранты, якія выцясьнілі і асэміявалі балтаў, што прыйшлі ў сваю чаргу на месца дабалцкага насельніцтва. І паверце, нашыя продкі не былі занадта талерантныя. Тагачасныя азіяты (бо менавіта адтуль прыйшлі нашыя продкі) «ядналіся» зь мясцовым насельніцтвам ня толькі з ласкі і дазволу апошніх, але ж і з дапамогай агню і мячу.

З ходам часу зьяўляюцца дзяржавы і гаспадары, якія лічаць зямлю выключна сваёй уласнасьцю. Паўстае важнае для ўтрыманьня дзяржавы пытаньне – падаткі. А як абкласьці падаткам людзей, якія проста ўвесь час перамяшчаюцца? Таму першымі, хто патрапіў пад пільны погляд хцівых манархаў, былі цыгане – адвечны народ-вандроўнік.

Недзе ў IX-X стагодзьдзі цыгане пакінулі Індыю. Паводле адной з вэрсыяў, гэта было зьвязана з вайной, якая спустошыла край. Іхная вандроўка пралягала праз Балканы ў Эўропу. Варта адзначыць, што ў «талерантнай» Эўропе таго часу было вельмі цяжка людзям не падобным да большасьці. Цыган абвінавачвалі ва ўсіх нядугах: ад засух і неўраджаяў да выкраданьня дзяцей. Паступова пачынаюць зьяўляцца першыя арышты і забароны ўваходу ў некаторыя гарады. У 1499 азлобленыя на цыганаў, недасяжных да падаткаў, Ізабэла і Фэрдынанд – тагачасныя ўладцы Гішпаніі – выдаюць першы загад, згодна зь якім, цыгане павінны былі знайсьці сабе сталае



Гэтак ЭС атрымала першыя краіны-тампоны – «новыя дэмакраты» Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы. Мэта – стрымліваць уцекачоў як мага бліжэй да рэгіёну іхнага пражываньня, нават калі прымаючыя краіны нездольныя альбо не жадаюць забясьпечваць выкананьне ўсіх працэдураў разгляду прашэньня аб прытулку і адпаведных правоў. З гэтай жа мэтай пазьней было распрацаванае паняцьце «бясьпечнага рэгіёну ўнутры краіны», якое прымяняецца ў дачыненьні да турэцкіх курдаў, а зь нядаўняга часу і да ўцекачоў з Чачэніі.

Вернемся аднак да Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы. Мы, але найбольш – шчасьлівыя кандыдаты на членства ў Эўрасаюзе, выконваем падвойную функцыю. З аднаго боку, ад нас патрабуецца стрымліваць іміграцыю праз мадэрнізацыю тэхнічных сродкаў кантролю межаў (якасьцю якога гэтак ганарацца нашыя памежнікі), пры чым большасьць нашых заходніх суседзяў атрымліваюць на гэта няхілыя пянёндзы ад ЭС. Гэтак, першы «санітарны кардон» (яшчэ адзін брусэльскі нэалягізм) складаецца з вышэйазначаных новых членаў. Як мы гэта ўжо адчуваем на сябе, яны абавязаны паступова зачыняць свае ўсходнія межы прапарцыянальна і ў абмен на большы доступ іхнай прадукцыі і рабочай сілы на адзіны заходнеэўрапейскі рынак. У 1998 годзе пры аўстрыйскім старшынстве быў прыняты Стратэгічны дакумэнт аб палітыцы ЭС адносна міграцый і правоў уцекачоў (CK4-27-ASIM 170, 1.07.1998). У ім адкрыта прапанавалася абумоўліваць эканамічную дапамогу той ці іншай краіне задавальненьнем патрабаваньняў ЭС адносна кантролю іміграцыі. Усе краіны падзяляюцца на некалькі «гатункаў». Першы складаецца з краінаў-удзельніц Шэнгенскай дамовы; другі аб'ядноўвае краіны-кандыдаты, якія павінны паступова набліжаць сваю міграцыйную палітыку да крытэраў Шэнгену (візы, памежны кантроль і дэпартацыі); трэці «гатунак» – гэта мы (краіны былога «саўка», Турцыя і Паўночная Афрыка), якія абавязаны канцэнтраваць свае высілкі на кантролі за транзытам і барацьбе з падпольнай перапраўкай мігрантаў на Захад (чым мы, у адпаведнасьці са статусам, пасьпяхова й займаемся), за што нам абяцаюць «эканамічнае супрацоўніцтва»; нарэшце, краіны апошняга «гатунку» (Блізкі Ўсход, «чорная» Афрыка, Кітай і г.д.) могуць адпачываць. Ад іх чакаецца толькі адно – не выпускаць свой зброд.

У будучыні, як паказваюць апошнія заявы Эўрасаюзу наконт «барацьбы зь нелегаламі», нас чакаюць яшчэ больш арыгінальныя ініцыятывы. Так што нашым нацыянальна-сьвядомым «эўрапейцам» трэба было б добра задумацца, перш чым патрабаваць дэпартацыі «ўсходніх нелегалаў» у Расею. Альбо рэалізацыя лёзунгу «Беларусь ў Эўропу» магчымая толькі пасьля прымусовага выкарыстаньня нашай краіны ў якасьці таннага гігіенічнага сродку. Дзякуй, што не туалетнай паперы... ■

Жэнэўская Канвэнцыя і іншыя дакумэнты

Мадэль міжнародных дзеяньняў у абарону ўцекачоў была ўсталяваная Лігай Нацыяў і прывяла да прыняцьця цэлага шэрагу міжнародных пагадненьняў па гэтаму пытаньню: пагадненьні ад 12 мая 1926 году і 30 чэрвеня 1928 году, Канвэнцыі ад 28 кастрычніка 1933 году і 10 лютага 1938 году. Хутка пасьля другой сусьветнай вайны наўзамен спэцыяльных дакумэнтаў, якія адносіліся да асаблівых катэгорыяў уцекачоў, было вырашана выпрацаваць адзіны дакумэнт, што зьмяшчае агульнае вызначэньне асобаў, якіх трэба лічыць уцекачамі.

Канвэнцыя аб статусу ўцекача была прынятая на Канфэрэнцыі паўнамоцных прадстаўнікоў Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў 28 ліпеня 1951 году і ўступіла ў дзеяньне 21 красавіка 1954 году. На сёньняшні момант Жэнэўская Канвэнцыя 1951 году і Пратакол да яе 1967 году падпісаныя больш чым ста краінамі сьвету і зьяўляюцца асноўнымі міжнароднымі дакумэнтамі, якія вызначаюць і рэгулююць прававое палажэньне ўцекачоў ■

ПРАПІСКІ

месца жыхарства, працу і, урэшце, перастаць валацужнічаць, інакш яны будуць выдаленыя з краіны. Максыміліян I у 1500 годзе загадаў усім цыганам зьехаць зь ягонай краіны. Тых, хто застаўся, чакалі турма ці сьмяротная кара.

У XVI стагодзьдзі ў розных эўрапейскіх краінах зьяўляюцца законы, якія забараняюць «цыганскі» лад жыцьця. Пад гэтую катэгорыю трапляюць ня толькі цыгане, але ж і іншыя людзі, якія менш арганізавана вандравалі па Эўропе ў пошуках лепшага жыцьця. Эміграваць зь месца на месца становіцца вельмі небясьпечна. Дарогі сярэднявечнай Эўропы час ад часу былі ўвешаныя трупамі «бадзягаў». Бадзягай мог стаць любы прадстаўнік ніжэйшага саслоўя, які вандраваў, напрыклад, у пошуках працы. Людзей, якія па нейкіх прычынах не пасьпелі ці ня мелі жаданьня ўсталявацца на адным месцы, высылалі на іншыя кантынэнты. Вялікую колькасьць цыганаў, напрыклад, чакалі Афрыка і Амэрыка.

Каб ня быць аднабаковым, трэба адзначыць, што тыя самыя манархі час ад часу самі запрашалі «эмігрантаў». Гэта вельмі падобна да таго, як сёньня разьвітая Эўропа запрашае да сябе навуковых спэцыялістаў. Напрыклад, Ягайла запрасіў у Вялікае Княства Літоўскае татараў, якія і па сёньняшні дзень жывуць у Іўеўскім раёне, а каралі польскія запрашалі габрэяў для падняцьця гандлю. Але ж эксплюатуючы эмігрантаў, трэба было трымаць іх пад кантролем. Кацярына, імпэратрыца расейская, выдае загад аб межы аседласьці для габрэяў. Габрэі, якія прыяжджалі на тэрыторыю Расейскай імпэрыі, павінны былі сяліцца толькі ў памежных гарадах і ня мелі права набываць зямлю. Эмігранты з прычыны іншаверства абкладаліся дадатковымі падаткамі і не маглі карыстацца ўсімі правамі грамадзяніна. Самае сьмешнае, што антыэміграцыйная палітыка ўладаў у працэсе сваёй эвалюцыі ператварылася ў замацаваньне чалавека на нейкім адным месцы. І ідучы яшчэ далей, улады пачалі забараняць міграцыю ўнутры самой дзяржавы. Прыкладам можа быць пашпартная сыстэма Савецкага Саюзу, калі ў сталінскія часы людзі зь вёскі (якая ў дадзеным выпадку нагадвае сёньняшнюю краіну трэцяга сьвету) не маглі перабрацца ў горад. І нават калі гэтыя загады былі зьнятыя, засталіся гарады, у якія і сёньня грамадзяне той самай краіны ня могуць свабодна ўехаць – напрыклад, Масква.

Палітыка ўтрыманьня чалавека на адным месцы, нарадзілася ня сёньня, і мэта яе вельмі простая: «Чым менш халоп ведае, чым менш альтэрнатываў бачыць, тым спакайней сьпіць пан» ■

Чужыя сярод чужых

Нелегальны сусьвет

МЭКСЫКА
За 2000 год амэрыканска-мэксыканскую мяжу перайшлі 320 млн. чалавек. Міграцыя замежных латынасаў у Мэксыку на сельска-гаспадарчыя работы дасягае 1 млн. у год, у тойсама час як мэксыканцы ўяжджаюць на сельска-гаспадарчыя работы ў Канаду.

КАНАДА
З-за перапаўненьня Канады ўрачамі, многія зь іх імігруюць у ЗША. За апошні год кожныя тры дні ўяжджалі 2 мэдыка.

КАЛУМБІЯ
Грамадзянская вайна, эканамічны крызыс раскідалі калумбійцаў па ўсяму сьвету: ЗША, Эквадор, Канада, Гішпанія, Коста-Рыка.

САЛЬВАДОР
6,1 млн. сальвадорцаў жывуць на радзіме, 1,5 млн. – у ЗША. У Сальвадоры 229 фабрыкаў, на якіх 80% працоўных – гэта жанчыны з маленькім заробкам і без працоўных кантрактаў. Мужчынам жа застаецца беспрацоўе.



ДАМІНІКАНСКАЯ РЭСПУБЛІКА
Насельніцтва 8,5 млн і Валавы Ўнутраны Прадукт (ВУП) 20 більёнаў USD, краіна багацейшая за Гаіці, таму рэгулярныя дэпартацыі гаіцянцаў дадому. Гаіцянцы прыяжджаюць працаваць на цукравыя і кававыя плянтацыі, каля 500 тыс. чалавек жывуць нелегальна. Дамініканская канстытуцыя дае аўтаматычнае грамадзянства дзецям, якія былі народжаныя ў краіне, таму гаіцянцы арганізоўваюць г.зв. «родавыя» туры цяжарным. Дамініканцам не патрэбная віза ў Японію, і яны зарабляюць тым, што прадаюць сваё паходжаньне.

АРГЕНТЫНА
У маі прайшоў бум пададзеных пашпартоў на эміграцыю ў Эўропу. Больш 50% аргентынцаў, калі будзе магчымысьць, хочуць іміграваць – у асноўным гэта людзі ва ўзросьце 30-42 гады.

НЯМЕЧЧЫНА
Уцекачы пратэстуюць супраць закону аб пражываньні, які роўны закону ў часы гета: я... павінны пражываць у строга вызначаным ме... пакідаць якое могуць толькі пры спэцыяльны... дазволе ўладаў. Дзякуючы бюракратыі, пра... легалізацыі цягнецца ад 3 да 10 гадоў. Лод... якія зьбеглі ад турмы, рэпрэсіяў, аказваюцц... зачыненымі ў адным раёне – тая самая тур... толькі ў большых памерах.

ПОЛЬШЧА
У той час як палякі езьдзяць зарабляць на сэзонныя сельска-гаспадарчыя работы ў Нямеччыну, польскія фэрмэры наймаюць на работу больш танных украінцаў.

РУМЫНІЯ
Штогод каля 1 млн. нелегалаў перасякаюць Румынію, уцякаючы на Захад.

ЛІБІЯ
Цэлы 93 мігрантаў, уключаючы 61 зь Нігерыі, былі знойдзеныя на паўднёвым усходзе Лібіі ў сярэдзіне мая. Людзі патрапілі на памежны пост, павярнулі назад, але толькі 25 здолелі выйсьці адтуль. Калі б не было гэтай мяжы, усе яны засталіся бы ў жывых.

ГАЛЯНДЫЯ
Каб не блытаць мігрантаў з Афра-Азіяцкага рэгіёну, вырашана [illegible] іхную радужную абалонку вачэй і [illegible] на спэцыяльную ідэнтыфікацыйную карту. Гэтак урад хоча вырашыць эўрапейскую праблему «ўсе [illegible] на адзін твар». Абмяркоўваецца праект па [illegible] умоваў прадстаўленьня палітычнага прытулку нелегальным уцекачам – прапаноўваецца [illegible] іх, каб выключыць сапраўдныя мэты іхных [illegible] на эміграцыю. У выніку такой палітыкі бацькі яшчэ больш будуць [illegible] дзяцей жахамі і вучыць іх маніць, каб застацца ў краіне, дзе ёсьць магчымасьць жыць

БЕЛАРУСЬ: уцекачам паўск...

Згодна з законам Рэспублікі Беларусь «Аб уцекачах» ад 1995 году, уцякач – гэта «асоба, якая не зьяўляецца грамадзянінам Рэспублікі Беларусь і знаходзіцца на тэрыторыі ў сілу дастаткова абаснаваных асьцярогаў стаць ахвярай прасьледаваньня ў краіне сваёй грамадзянскай прыналежнасьці па прызнаку расы, рэлігіі, грамадзянства, нацыянальнасьці, прыналежнасьці да пэўнай сацыяльнай групы альбо палітычных меркаваньняў і якая ня можа ці не жадае ў выніку такіх асьцярогаў карыстацца абаронай гэтай краіны; альбо асоба, якая ня маючы сталага грамадзянства і, знаходзячыся на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у выніку падобных абставінаў, ня можа ці не жадае вярнуцца ў краіну свайго папярэдняга звычайнага месцажыхарства ў сілу такіх асьцярогаў». Аднак далёка ня кожны, хто на наш погляд падыйшоў бы пад гэтую фармулёўку, можа атрымаць у нас статус уцекача. Лёс чалавека тут вырашаюць [illegible]

міграцыйнай службы Рэ...
выступаюць зусім не на я...
Па становішчу на канец ...
531 чалавек атрымаў афі...
па прыкладных падліках х...
знаходзіцца больш за 13...
падыходзяць пад паняць...
нелегальна. У 2000 годзе...
зарэгістраваныя, а 21 ...
Абскарджаньне адмоў...
прыносіць пладоў і пры...
вялікіх для яго грошай (...
дарослага члена сям'і)...
гэткая сума для некато...
чалавек толькі аказваю...
найчасьцей амаль ня...
часу прадаць кватэр...
быць, калі бяжыш –...
Асноўная маса уцека...

ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ
У нацыянальныя прыярытэты праваахоўных органаў побач з гандлем наркотыкамі ўвайшла арганізаваная злачыннасьць ва ўвозе іншага тавару – людзей.

ПАКІСТАН
Легальна як уцекачы ў ім жывуць 2,5 млн. афганцаў і яшчэ палова мільёну – нелегальна. Пакістан хоча закрыць мяжу з Афганістанам і вярнуць уцекачоў, прыбыўшых пасьля чэрвеня 2001 году, назад. Але што яны будуць рабіць там бяз дому, грошай, ва ўмовах вайны – гэта пакістанскі ўрад не цікавіць.

КАЗАХСТАН
Рэгулярная паліцэйская апэрацыя «Права і парадак» за красавік 2001 году злавіла сярод казахаў 85 тыс. замежнікаў з Турцыі, Кітаю, Афганістану і Пакістану. Чыі правы на свабоду адстойвала гэтая паліцыя, не вядома.

РАСЕЯ
Тут жыве каля 1,5 мігрантаў з Афганістану, Самалі і Анголы. Чачэнскіх уцекачоў цяжка падлічыць.

ПАЎНОЧНАЯ КАРЭЯ
Каля 100 тыс. чалавек штогод зьбягаюць у Кітай і асядаюць у «лягерах свабоды» ў пошуках ежы.

ТУРЦЫЯ
Пасьля атрыманьня 16 більёнаў даляраў ад МВФ, паток беспрацоўных турэцкіх дзяржаўных служачых захліснуў Эўропу.

ПАЎДНЁВАЯ КАРЭЯ
На сакавік 2001 году ў краіне знаходзілася каля 200600 нелегалаў. У асноўным гэта кітайцы, якія бягуць ад рэжыму. Замежныя рабочыя аб'яднаныя ў Хартыю рабочых-мігрантаў.

ІНДЫЯ
З 1971 году каля 500 тыс. бангладэшцаў, пераплыўшы Брахмапутру, аселі ў індыйскім штаце Асам. У гэтым штаце 2,6 млн. замежнікаў, у асноўным гэта ўцекачы ад вайны за незалежнасьць Бангладэшу.

В'ЕТНАМ
Ужо шмат гадоў пасьля вайны нязначная частка насельніцтва жыве ў Камбоджы. Камбоджа патрабуе рэпатрыяцыі в'етнамцаў, В'етнам жа пратэстуе.

ТАЙВАНЬ
Тут працуюць каля 328 тыс. замежных рабочых па прычыне больш-менш прыстойнага заробку. Мясцовыя рабочыя ствараюць прафсаюзы для барацьбы з «замежнымі канкурэнтамі».

САЎДАЎСКАЯ АРАВІЯ
Міністар працы на выступу 8 мая заявіў аб плянаваньні наняць ад 6 да 7 млн. замежных рабочых да 2030 году, хаця ў праекце 13,5 млн. На сёньня саўдаўскія рабочыя складаюць 3 млн. з 10 млн. рабочых у краіне, бо палова насельніцтва (14 млн. саўдаўцаў і 8 млн. замежнікаў) – гэта моладзь да 18 гадоў. У сувязі з гэтым урад лічыць неабходным якасны скачок у адукацыі.

МАЛАЙЗІЯ
Гэта краіна-турма для інданэзійскіх нелегалаў. На май 2001 году каля 6 тыс. нелегалаў жывуць у спэцыяльных лягерах. З-за высокага ўзроўня беспрацоўя 600 тыс. легальных інданэзійскіх рабочых працуюць у Малайзіі.

АЎСТРАЛІЯ
Міністар іміграцыі настойвае на квоце ў 15 тыс. уцекачоў і ў першую чаргу тых, чыя сям'я знаходзіцца ўжо ў краіне. У выніку чаго ў Аўстраліі адбываюцца штомесячныя хваляваньні ў лягерах уцекачоў.

ГВІНЭЯ
Гэта «перасылачны пункт» у Аўстралію.


... аб
... гета...
... ...ным ...есцы,
... цыяльным
... ...ы, працэс
... ...ў. Людзі
... зваюца
... ...мая турма.

...ўсюль у нас дарога – будзе вам і дом, і дапамога

...жбы Рэспублікі Беларусь, а яны
... не на ...ным баку.
... канец ...авіка 2001 году ў Беларусі
...маў аф...ны статус уцекача. Але
...аліках на тэрыторыі рэспублікі
...п за 15 тыс. чалавек, якія
... паняцьце «ўцякач», амаль усе –
...0 годзе 69 чалавек былі афіцыйна
...а 219 ... ў рэгістрацыі.
...дмоўны ... суд амаль ніколі не
...ў і пры... патрабуе ад уцекача
...онаў (0,5 мін. заробкаў з кожнага
...сям'і ... за праціцьне ў суд),
...екатор... проста не рэальная. Калі
...а зваесе... Беларусі ў яго
...ль нічо... ма, бо калі бяжыш, няма
...пру ... машыну, якіх можа і ня
...ы – губ... усё.

вайна, але нашыя ўлады, мяркуючы па усім, ня згодныя
з гэтым. У 2000 годзе 88 афганцаў атрымалі адмову ў
рэгістрацыі (пры 93 зарэгістраваных), чыноўнікам
абыякава тое, што ў выпадку вяртаньня гэтых людзей
хутчэй за ўсё чакае сьмерць, яны ня лічаць іх
уцекачамі. 49 чалавек з Чачэніі таксама атрымалі
адмоўны адказ. Беларускія ўлады ўвогуле не
рэгіструюць у якасьці ўцекачоў грамадзянаў «брацкай
Расеі», бо афіцыйна ў усходняга суседа ўсё добра і
ніякай вайны няма і не было.
Як мы ўбачылі, афіцыйных уцекачоў у нас ня шмат, але
большасьць нелегалаў не зьбіраецца прасіць статус
уцекача на Беларусі, яны жадаюць трапіць на Захад.
Сярод гэтых людзей ёсьць тыя, хто бяжыць ад вайны ці
рэпрэсіяў, але пераважная большасьць уцякае ад голаду
і холаду, ад эксплюатацыі і цяжкіх умоваў жыцьця,
шукаючы лепшай долі для сваіх дзяцей...
Няма статыстыкі па гэтых людзях. Ніхто ня ведае
дакладных лічбаў. Але аб гіганцкіх маштабах гэтай
... лічыць па тым, што вакол

нелегальнага пераходу мяжы ўжо сфармаваўся свой бізнэс. Людзей правозяць у багажніках аўтамабіляў, у вялікіх фурах пад таварам, праз спэцыяльныя падкопы пад мяжой, але найчасьцей проста даючы «на лапу» мытніку ці пагранцу. У гэтым бізнэсе людзі – гэта такі сама тавар, як гарэлка ці цыгарэты. Вядомыя выпадкі, калі нелегалы паміралі ў багажніках аўтамабіляў ад недахопу паветра. Калі чалавека ловяць у момант нелегальнага пераходу праз мяжу, ён апыноўваецца ў турме. Па беларускаму заканадаўству незаконны пераход мяжы – гэта крымінал. Таму нашыя і без таго перапоўненыя турмы, папаўняюцца пасутнасьці ні ў чым не вінаватымі людзьмі. Менавіта з-за гэтага людзі хаваюцца ад уладаў і існуюць літаральна ў падпольлі. Мяжа – гэта ня толькі праблема нелегалаў, мяжа – гэта праблема грамадзтва ■



Супраць

«Супраць межаў – Супраць нацыяналізму – Нелегальных людзей не бывае!» – пад гэткім лёзунгам праходзіць у гэтым годзе агульнаэўрапейскі караван супраць межавай і іміграцыйнай палітыкі Эўрапейскага Саюзу. Падчас гэтага каравану ўлетку і ўвосені па ўсёй Эўропе пройдуць шматлікія культурныя і палітычныя акцыі, якія ставяць сваёй мэтай прыцягнуць увагу людзей да праблемаў глябалізацыі і іміграцыйнай палітыкі Эўрапейскага Саюзу.

З кожным годам ўсё больш людзей выказваюць сваю нязгоду і занепакоенасьць тым, што Эўропаператвараецца ў крэпасьць, агароджаную новай жалезнай заслонай. Жыхарам краінаў, што не ўваходзяць у Шэнгенскую дамову ці Эўрапейскі саюз, усё цяжэй і цяжэй атрымаць дазвол на ўезд, не гаворачы ўжо пра тое, каб атрымаць від на жыхарства. Такая палітыка ўрадаў абмяжоўвае правы чалавека на свабодны выбар месца жыхарства, свабодны рух, а таксама правакуе рост нацыяналістычных і расісцкіх настрояў у грамадзтве.

Усе гэтыя нэгатыўныя тэндэнцыі прывялі да неабходнасьці аб'яднаньня лявацкіх і антырасісцкіх арганізацыяў у агульнаэўрапейскі рух супраць межаў і дэпартацыі. Пачатак гэтаму аб'яднаньню быў пакладзены ў кастрычніку 1999 году, калі падчас



◀ Беларускія палітычныя ўцекачы ў Празе (Чэхія).

правядзеньня саміту кіраўнікоў урадаў краінаў Эўрапейскага Саюзу ў Тампэры (Фінляндыя) быў праведзены контарсаміт і контардэманстрацыя, што асуджалі межавую, дэпартацыйную і эканамічную палітыку Эўрасаюзу. «Больш кантролю, больш абмежаваньняў, больш дэпартацыяў», – гэтак ахарактарызавалі палітыку ЭС удзельнікі контарсаміту.

Затым, у студзені 1999 году ў Амстэрдаме адбылася першая сустрэча антыгранічных актывістаў. На ёй былі прадстаўнікі груповак з Францыі, Італіі, Вялікабрытаніі, Нідэрляндаў, Швайцарыі, Даніі, Бэльгіі, Нямеччыны і Польшчы. Другая сустрэча аб'яднанага агульнаэўрапейскага супрацьмежавага руху адбылася ўлетку 2000 году ў Познані (Польшча), дзе да гэтай ініцыятывы далучыліся ўкраінскія і гішпанскія актывісты. Такім чынам, агульнаэўрапейская аб'яднаная антыгранічная сетка пачала дзейнічаць. А ў 2001 годзе да ейнай дзейнасьці далучыліся групы зь Беларусі і Расеі.

Але ж ня трэба думаць, што антыгранічны і антыдэпартацыйны рух пачаўся толькі тры гады таму – гэта ня так. У 1999 годзе ўтварылася толькі аб'яднаная міжнародная сетка, у якую ўваходзяць шматлікія антырасісцкія і лявацкія групы са шматлікіх эўрапейскіх і ня толькі краінаў сьвету. А асобныя акцыі і ініцыятывы праходзяць па ўсім сьвеце ўжо даволі даўно. Напрыклад, ініцыятыва «Нелегальных людзей не бывае» існуе ўжо шмат гадоў і на ейным ліку не адзін дзясятак акцыяў.

Але ж вернемся да міжнароднай антыгранічнай сеткі. Яе дзейнасьць разьвіваецца ў дзвюх асноўных напрамках. Па-першае, гэта арганізацыя міжнародных кампаніяў пратэстаў і распаўсюд інфармацыі: актывісты арганізуюць кампаніі супраць кантораў, якія нажываюцца за лік дэпартацыяў і ператварылі гэта ў сапраўдны бізнэс, такісамы як і правоз нелегальных імігрантаў. Гэтаму бесчалавечнаму бізнэсу павінен прыйсьці канец! Таксама шматлікія



Эўропа ў

20 чэрвеня на базе клюбу «4 апельсіны», што знаходзіцца ў падвале ДК МТЗ, адбыўся трэнінг для моладзі Менску «Што такое праблема ўцекачоў у Эўропе». Акцыя была добра замаскіраваная. Да самага пачатку ўсе меркавалі, што гэта звычайны канцэрт. Дзіўным было толькі тое, што ніхто ня ведаў, хто і на якія грошы яго ладзіць (уваход на канцэрт быў бясплатным). Але на гэта зьвярнулі ўвагу толькі самыя заўзятыя аматары халявы. Асноўная ж маса звычайных тусоўшчыкаў ні аб чым не здагадвалася. Менавіта на гэта разьлічвалі арганізатары, а гэта былі не якія-небудзь рокеры ці панкі, а самі бязгрэшныя хрысьціянскія дэмакраты!

Праўду кажучы, грошы яны ўзялі не з уласных фондаў, а з грошаў УВКБ ААН, але ж гэта не істотна – уцекачы пераб'юцца.

Чуткі аб тым, што будзе халяўны канцэрт, вельмі хутка расплыліся па гораду. І ўжо за 10 хвілінаў да пачатку на пляцоўцы перад уваходам сабралося чалавек 100 – на самой справе, столькі тусоўшчыкаў разам я ня бачыў ужо даўно. Нішто не прадказвала дурнога. І вось хтосьці сказаў, што ўжо пачалі граць. Народ пачаў уваходзіць. Я таксама трапіў у памяшканьне, але ўбачыўшы, што каманда яшчэ толькі настройваецца, выйшаў з падвалу на вуліцу. Гэта была асноўная стратэгічная памылка, і я ня быў адзіным, хто яе зрабіў.

Неўзабаве трэнінг пачаўся. Ужо калі пачала граць другая банда, ахова на чале з галоўным адміністратарам клюбу раптам перакрыла ўваход. «Вы лішнія. Заля аплочаная толькі на 50 чалавек», – заявілі яны. Вось гэта і была асноўная «фішка» мерапрыемства! Арганізатары ўдала імітавалі Эўропу ў паменшаным памеры. Тыя, хто трапіў у залю, сымбалізавалі сабой «цывілізаваных» эўрапейцаў, а тыя, хто застаўся на сьвежым паветры, – «брудных» нелегалаў. Цікава, што сярод апошніх апынуліся нават некалькі музыкаў (потым іх прапусьцілі). Спачатку народ спрабаваў скандаліць, а потым, зразумеўшы, што з гэтага нічога не атрымаецца, пачаў намагацца па-ціху прапіхнуцца ў залю нелегальна. Толькі невялікая кучка адмарозкаў, якія аказаліся задужа прынцыповымі (сярод іх быў і я), адмовіліся ад спробаў усё ж прайсьці і байкатавалі

межаў і нацыяналізму

no BORDER
no NATION
caravans 2001



◀ Летнік супраць межаў – змагайся і адпачывай!

актывісты з розных краінаў выдаюць бюлетэні, газэты, улёткі, стыкеры, дзе крытыкуюцца сучасны стан справаў у сьвеце, палітыка глябалізацыі і нэалібэралізму, а таксама межавая палітыка Эўрасаюзу. Але толькі крытыкай гэта не абмяжоўваецца: на старонках гэтых выданьняў можна ўбачыць іншы сьвет – сьвет бязь межаў, сьвет, дзе чалавечая асоба, а ня грошы, адыгрывае галоўную ролю.
Па-другое, гэта арганізацыя антымежавых летнікаў пратэсту, а таксама дэманстрацыяў і акцыяў прамога дзеяньня. У апошнія тры гады быў вынайшаны новы спосаб антымежавага супраціву – памежныя летнікі пратэсту. Мэтай гэтых летнікаў зьяўляецца прыцяг увагі грамадзкасьці да памежных праблемаў, такіх як жорсткасьць мытных служачых, узмацненьне правілаў пераходу праз мяжу і гэтак далей. У 2000 годзе ў Эўропе прайшло тры такіх летніка. Першы адбыўся на тэрыторыі Польшчы на яе славацка-ўкраінскім памежжы (дарэчы, удзельнікамі гэтага летніку былі і нашыя беларускія таварышы), затым летнікі адбыліся ў Нямеччыне – на нямецка-польскім памежжы, і на ўзьбярэжжы Сыцыліі. Падчас правядзеньня летнікаў адбыліся шматлікія дыскусіі, антымежавыя акцыі, таксама вялася праца зь мясцовым насельніцтвам. Сёлета такіх летнікаў, і ўвогуле акцый, адбудзецца і ўжо адбылося значна больш. Адзін зь летнікаў адбудзецца на польска-беларускім памежжы (як прыняць у ім удзел глядзіце на 8-ай старонцы «Чорных Навінак»).
У чытача можа ўзьнікнуць пытаньне: маўляў, нямецка-польскае памежжа – усё зразумела – Нямеччына ўваходзіць у ЭС, а Польшча пакуль не, але пры чым тут беларуска-польскае ці ўкраінска-польскае памежжа? Адказ вельмі просты: польскі ўрад жадае ўвайсьці ў Эўрапескі Саюз, але, каб гэта адбылося, ён павінен выканаць некалькі патрабаваньняў ураду ЭС, у тым ліку ўзмацніць межавы рэжым зь не-ЭС краінамі, гэта значыць, увядзеньне візаў для грамадзянаў Беларусі, Украіны, Расеі і іншых не-ЭС краінаў. Усё гэта ня толькі ўскладніць для нас і так нявельмі просты ўезд у Эўропу, але таксама перакрые амаль адзіную крыніцу існаваньня шматлікім дробным гандлярам ■

Кэмпінг 2001

2-8 ліпеня – Тарыфа (Андалузія, Гішпанія)
4-8 ліпеня – Пэтышоўцы (Славенія)
5-12 ліпеня – Крынкі (Польшча)
21-24 ліпеня – Генуя (Італія)
28 ліпеня-5 жніўня – Франкфурт-на-Майне (Нямеччына)
24-26 жніўня – Тыхуана (Мэксыка)

Усю інфармацыю па гэтых летніках вы можаце знайсьці ў Інтэрнэце: **www.noborder.org** – сетка «Межам – не!»



мініяцюры

гэтае мерапрыемства. Цікава, што тыя, хто апынуўся ў скуры «эўрапейцаў», паявілі сябе зусім як іхныя прататыпы: большасьць рабіла выгляд, што нічога дурнога не адбываецца і ўсё цалкам натуральна, а астатняя меншасьць на чале з гуртом SCUM OUT задумала правесьці акцыю пратэсту. Падчас свайго выступу яны паміж песьнямі пачалі гарланіць у мікрафон тэксты супраць адміністрацыі клюбу, Эўрасаюзу, УВКБ ААН і неўзабаве былі адключаныя (пасьля другой кампазыцыі). Іншыя гурты ніяк не адрэагавалі на хамскія паводзіны адміністрацыі і, не праявіўшы ніякай салідарнасьці ні з тымі, хто застаўся на вуліцы, ні з камандай пратэстуючых, працягвалі канцэрт – ну ня ўсім жа быць такімі прынцыповымі!
Такім чынам, хрысьціянскія дэмакраты разам з УВКБ ААН і клюбам «4 апельсіны» правялі пасьпяховую акцыю-трэнінг і паказалі, што ні на якую салідарнасьць з уцекачамі разьлічваць у нас не прыходзіцца. Тусоўка ж паказала, што яна клала нават на сваіх знаёмых і сяброў, не гаворачы ўжо аб якіхсьці уцекачах ці нелегалах. Слоган СЭКС, НАРКОТЫКІ і РОК-Н-РОЛ застаецца асноўным жыцьцёвым прынцыпам для асноўнай большасьці сучаснай моладзі! Добра гэта ці дрэнн – вырашайце самі. А я мяне ўжо дастала быць нелегалам ■

«Мытня» пільна ахоўвала залю ад музыкаў... ці музыкаў ад залі? ▼





Lufthansa – канцавы прыпынак

У маі 1999 году на барту самалёту авіякампаніі Lufthansa загінуў суданскі ўцякач Махамэд Амір Абэб, якога трое нямецкіх афіцэраў паліцыі дэпартавалі зь Нямеччыны ў Судан. Махамэда закавалі ў наручнікі, надзелі на галаву матацыклетны шлем і так уціснулі ў крэсла, што ён ад недахопу паветра задыхнуўся. Сьмерць 30-гадовага ўцекача стала прычынай кампаніі «Нелегальных людзей не бывае», распачатай супраць Lufthansa. Але Lufthansa не адзіная авіякампанія, якая зарабляе грошы на дэпартацыі нелегалаў. Акцыі пратэсту адбываюцца ў Францыі, Бельгіі і Галяндыі супраць такіх авіякампаніяў як Air France, Sabena і KLM.
Кампанія «Нелегальных людзей не бывае» пратэстуе супраць эўрапейскай практыкі дэпартацыі нелегалаў і той вялікай ролі, якую граюць тут авіякампаніі. Акцыі праводзяцца з мэтай прыцягнуць увагу пасажыраў і супрацоўнікаў авіякампаніі да гэтай бесчалавечнай зьявы, а галоўнае – вымусіць Lufthansa і іншыя авіякампаніі, якія займаюцца дэпартацыямі, скончыць гэты антыгуманны бізнэс ■

АДЧЫНІЦЬ МЕЖЫ, ЗАЧЫНІЦЬ МІНІСТЭРСТВЫ!

Інфармацыя аб летніку ў в.Крынкі, Польшча (5-12.07.2001)

Мы – кампанія «Нелегальных людзей не бывае!» – арганізуем міжнародны летнік супраць межаў. Ён будзе праходзіць на польска-беларускай мяжы недалёка ад польскай вёскі **Крынкі**. Мы выступаем **супраць** міграцыйнай палітыкі Эўрапейскага Саюзу, закрыцьця ўсходніх межаў для неграмадзянаў ЭС (шляхам узмацненьня жорсткасьці рэжыму, узмацненьня кантролю на мяжы і г.д.), **супраць** дэпартацыі «нелегальных» эмігрантаў, **супраць** нацыяналізму. Мы хацім сумясьціць палітычныя акцыі зь цікавай культурнай праграмай: канцэртамі, вулічнымі хэпінінгамі, дэманстрацыямі. Месца, дзе будзе праходзіць летнік, - мульцікультурны рэгіён.

Летнік адкрываецца дэманстрацыяй у **Беластоку 6 ліпеня**. Прыехаць у Беласток можна ўжо 5-га, каб прыняць удзел у падрыхтоўцы. **7 і 8 ліпеня** ў вёсцы Крынкі пройдуць дні **польска-беларуска-расейска-ўкраінскай культуры**: спэктаклі, вулічныя акцыі, панк-, рок- і фольк-канцэрты, дыскусіі.

Праграма на **9-12 ліпеня** будзе складзеная ў летніку: ёсьць ідэі правядзеньня акцыяў у памежных раёнах на поўначы Польшчы, трэнінгаў акцыяў прамога дзеяньня, сэмінара па фэмінізму, абмена інфармацыяй аб анархічным і антыгранічным руху ў розных краінах.

Мы запрашаем у летнік усіх людзей, згодных зь лёзунгамі кампаніі «Нелегальных людзей не бывае!»

Спынім ператварэньне Эўропы ў крэпасьць!
Свабоду перамяшчэньня – людзям, а не капіталам!

РАСКЛАД ПАДЗЕЯЎ У ЛЕТНІКУ СУПРАЦЬ МЕЖАЎ БЕЛАСТОК-КРЫНКІ (ПОЛЬШЧА):

5-12.07.2001

Чацьвер, 5 ліпеня, Беласток
Сустрэча, падрыхтоўка дэманстрацыі, абмеркаваньне плянаў, прагляд фільмаў.

Пятніца, 6 ліпеня, Беласток-Крынкі
11:00 Прэс-канфэрэнцыя ў Беластоку.
12:00 Дэманстрацыя, стрыт-паці.
15:00 Аўтобус у Крынкі (з турыстычным прыпынкам, агляд славутасьцяў гораду Супралскі).
Вечар – разьбіўка летніку, вечарына, camp fire.

Субота, 7 ліпеня, Крынкі
10:00 Арганізацыйны сход.
12:00 Прэс-канфэрэнцыя і прадстаўленьне групаў з Украіны, Расеі, Беларусі і інш.
14:00 Сэмінары, музычныя акцыі.
19:00 Канцэрт.

Нядзеля, 8 ліпеня, Крынкі
10:00 Арганізацыйны сход.
11:30 Сэмінары.



12:00 Сустрэча ў мясцовай сінагозе з паэтамі.
13:00 Падзеі, рынак D.I.Y.-прадукцыі.
19:00 Канцэрт.

7-8 ліпеня
Магчымыя і іншыя падзеі: вулічныя шэсьці, выставы, тэатар.

Панядзелак, 9 ліпеня, Крынкі
10:00 Арганізацыйны сход.
11:00 Турызм.
17:00 Сэмінары.

Аўторак, 10 ліпеня, Крынкі
10:00 Арганізацыйны сход.
12:00 Анархістычныя спартыўныя гульні.
15:00 Дыскусіі, сэмінары.

Серада, 11 ліпеня, Крынкі
10:00 Арганізацыйны сход.
11:00 Дыскусіі, сэмінары.
13:00 Турызм.

УНУТРАНАЕ ЖЫЦЬЦЁ ЛЕТНІКУ.

Летнік будзе знаходзіцца на прыродзе каля вёскі **Крынкі** (Польшча) у некалькіх кілямэтрах ад беларускай мяжы. Летнік будзе намётавы, таму неабходна ўзяць з сабой усё абсталяваньне: **намёты, спальнікі, плёнку ад дажджу, міску, кружку, лыжку і г.д**. Будзе забясьпечанае **аднаразовае харчаваньне**, грошы на яго будуць зьбірацца па прынцыпу «хто колькі можа даць». У астатні час адпаведна харчаваньне самастойнае (кансэрвы, прыгатаваньне ежы на вогнішчы, бары ў вёсцы – у залежнасьці ад густу і фінансаў).

У летніку ёсьць пэўныя **прынцыпы ўнутранага жыцьця**, шмат зь якіх будуць у навінку людзям, ніколі ня быўшым на такіх тусоўках. **ЗНАХОДЖАНЬНЕ Ў ЛЕТНІКУ Ў МОЦНА ЗЬМЕНЕНЫМ СТАНЕ ПАД УЗЬДЗЕЯНЬНЕМ АЛЬКАГОЛЮ І НАРКОТЫКАЎ НЕ ВІТАЕЦЦА**. **Недарэчнымі будуць любыя формы дыскрымінацыі - па расаваму, нацыянальнаму і полаваму прызнаку**. У летніку **не мяркуецца** начальства, авангарду і абслугоўваючага пэрсаналу. **Усе** запрашаюцца да ўдзелу ў дыскусіях, сходах, прыгатаваньні ежы, прыбіраньні тэрыторыі і іншых формах жыцьця летніку; прыняцьце рашэньняў аб падзеях у летніку залежыць ад усіх ягоных удзельнікаў. Пасіўныя паводзіны звычайна выклікаюць маўчалівае неадабрэньне. Так што будзьце актыўнымі: гэтак будзе весялей і вам, і прысутным. Таксама шмат якія эўрапейскія і беларускія ўдзельнікі летніку прытрымліваюцца ладу жыцьця «straight edge» – г.зн. што яны вэгетарыянцы, выступаюць за здаровы лад жыцьця і за байкот карпаратыўных прадуктаў.

ЯК ДАБРАЦЦА ДА ЛЕТНІКУ.

Гародня-Беласток лепей ехаць аўтастопам. У Гародне даяжджаеце да **Савецкай плошчы** на любым транспарце, там садзіцеся на **7 тралейбус**, едзеце да канцавога прыпынку. Трохі праходзіце і ловіце машыну на **Брузгі** – памежны пераход (часам трэба за гэта плаціць). У Брузгах высаджваецеся і ідзеце ўздоўж шэрагу машынаў у бок мяжы. Лепей ісьці ў пачатак чаргі і пытаць вольныя месцы. Ахвотней бяруць людзей, якія не вязуць алькаголю і цыгарэтаў, бо кіроўца прапануе правезьці сваю кантрабанду – паслуга за паслугу. Пераехаць мяжу да **Кузьніцы** каштуе 1 $ ці да **Беластоку** – 2 $. Гэты шлях працуе надзейна і бесьперабойна. Другі шлях – на электрычцы **Гародня-Кузьніца**: яна ходзіць у **3:25**, **6:56**, **9:58**, **13:27**, **17:52** і каштуе каля 2$, потым перасаджваецеся на электрычку да Беластоку, якая ходзіць кожную гадзіну і каштуе яшчэ 3$.

Калі хто зьбіраецца адразу ехаць у летнік у Крынкі, неабавязкова ехаць Гародня-Беласток-Крынкі, можна ехаць **Гародня-Сакулка** (15 хвілінаў язды ад Кузьніцы на электрычцы)-**Крынкі** (паўгадзіны на аўтобусе).

Сустрэча **5-га ліпеня** ў **12:00**, **15:00** і **17:00** у **Беластоку на чыгуначным вакзале**, але гэта для тых, хто жадае браць удзел у падрыхтоўцы дэманстрацыі. Калі вы адразу едзеце на дэманстрацыю, то **6 ліпеня** яна пачынаецца ў **12:00 на вуліцы Lipowa** (каля царквы Roch – белая вялікая царква ў цэнтры гораду, якую ўсе ведаюць). Пасьля дэманстрацыі ў Беластоку 6 ліпеня ўвечары будзе арганізаваны **аўтобус** Беласток-Крынкі (50 км, 45 хв. язды), які будзе каштаваць 4 ці 5 злотых (грошы пойдуць на агульныя патрэбы).

КАНТАКТЫ Ў МЕНСКУ: (017) 256-50-61, 220-83-77 НАСЬЦЯ, ПАША/ У ГАРОДНЕ: (0152) 44-07-83 САША/ У БЕЛАСТОКУ: (49) 0-604-142-155

УВАГА! ПАКУЛЬ ЯШЧЭ ІСНУЮЦЬ МЕЖЫ, ІСНУЮЦЬ І МЫТНІКІ!